Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_______________ А. А. Корбут
«_____»_______________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ______/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТВОРЧА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ АРГАНІЗАЦЫІ КОНКУРСАЎ І СПАБОРНІЦТВАЎ ПА СПАРТЫЎНА-БАЛЬНЫМ ТАНЦЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*

2017

Вучэбная праграма састаўлена на аснове адукацыйнага стандарту – Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках) [Зацв. М-вам адукацыі Рэсп. Беларусь 17.05.2013: Уведз. 01.09.2013. – Мінск: М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Б.г. (2013)]

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*В. М. Парахневіч*, выкладчык кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М. В. Філатава*, дацэнт кафедры майстэрства акцёра ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»;
*А. Я. Камінскі*, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 15.03.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 27.01.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. М. Парахневіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Творча-метадычныя асновы арганізацыі конкурсаў і спаборніцтваў па спартыўна-бальным танцы» з’яўляецца адной з самых важных у прафесійным навучанні будучых спецыялістаў у галіне бальнага танца. Спартыўна-бальны танец вылучаецца ў асобную катэгорыю спосабам выканання танца, які дакладна рэгламентаваны Сусветнай федэрацыяй танцавальнага спорту (WDSF). Вучэбная дысцыпліна «Творча-метадычныя асновы арганізацыі конкурсаў і спаборніцтваў па спартыўна-бальным танцы» мае непасрэдную сувязь з такой спецыяльнай дысцыплінай, як «Спартыўна-бальны танец». Менавіта з ёй звязана набыццё дасканалага выканання прадпісаных фігур, крокаў і поз. Вучэбная дысцыпліна разлічана на 3 гады навучання (5 семестраў) і ўключае як тэарэтычныя, так і практычныя заняткі.

Тэарэтычная частка вучэбнай дысцыпліны знаёміць студэнтаў з гісторыяй конкурснага руху ў свеце і ў Беларусі, са спецыяльнымі патрабаваннямі да выканання фігур у пэўных класавых катэгорыях, з правіламі па знешнім выглядзе выканаўцаў, з работай рэжысёрска-пастановачнай групы на спаборніцтвах па бальным танцы, з рознымі сістэмамі судзейскай ацэнкі.

*Галоўнай мэтай* практычнай часткі вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў практычных уменняў і навыкаў у сферы арганізацыі спаборніцтваў па бальным танцы з улікам усіх патрабаванняў, якія прад’яўляюцца Сусветнай федэрацыяй танцавальнага спорту.

На практычных занятках выпрацоўваюцца навыкі аб’ектыўнага судзейства на конкурсах, авалодваецца методыка падрыхтоўкі і правядзення конкурсаў па спартыўным бальным танцы. Практычныя заняткі з’яўляюцца асновай вучэбнай дысцыпліны.

Значную ролю ў вучэбным працэсе адыгрывае самастойная праца студэнтаў, накіраваная на ўдасканаленне прафесійных выканальніцкіх навыкаў у сферы арганізацыі турніраў рознага ўзроўню. Студэнты вывучаюць дадатковую літаратуру, Інтэрнэт і відэаматэрыялы, наведваюць спаборніцтвы па бальным танцы і атрымліваюць вопыт у якасці памочнікаў арганізатараў конкурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метадычнымі асновамі і эфектыўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца:

– дзейнасны падыход як аснова навучання;

– метад аналізу (уменні аналізаваць і рабіць высновы пры экспертнай ацэнцы танцавальных пар на конкурсах, уменні састаўляць бізнес-план арганізацыі конкурсаў і танцавальных студый);

– камунікатыўныя тэхналогіі;

– гульнявыя тэхналогіі, у рамках якіх студэнты спрабуюць сябе ў якасці суддзяў, трэнераў, арганізатараў спаборніцтваў і заснавальнікаў танцавальных школ.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– гісторыю конкурснага руху ў бальным танцы ў свеце і ў Беларусі;

– спецыяльную тэрміналогію і класіфікацыйныя фігуры бальнага танца;

– асноўныя правілы сістэмы падліку вынікаў спаборніцтваў – «Скейтынг»;

*умець:*

– вызначаць пераможцаў турніраў з дапамогай сістэмы «Скейтынг» і вырашаць спрэчныя пытанні;

– ацэньваць танцавальныя пары на спаборніцтвах па бальным танцы выкарыстоўваючы розныя судзейскія сістэмы;

– арганізоўваць конкурсы рознага ўзроўню: ад унутрыклубных да рэспубліканскіх;

– састаўляць каштарыс расходаў і даходаў пры арганізацыі спаборніцтваў;

– афармляць запрашэнні на турніры па афіцыйным узоры;

– распрацоўваць бізнес-план адкрыцця танцавальнай студыі.

Засваенне вучэбнай праграмы па спецыяльнасці 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец) павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-11. Актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах як мясцовага (студэнцкія навуковыя грамадства), так і агульнанацыянальнага (фестывалі, пленумы і г. д.) значэння.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-27. Вывучаць, абагульняць практычны і тэарэтычны вопыт айчыннага і замежнага харэаграфічнага мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК- 28. Удзельнічаць у распрацоўцы і ўкараненні методык арганізацыі і кіраўніцтва харэаграфічнай адукацыяй і мастацкай творчасцю, у распрацоўцы і апрабацыі новых педагагічных тэхналогій.

ПК-29. Распрацоўваць вучэбна-метадычныя матэрыялы, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, ажыццяўляць метадычныя распрацоўкі па адпаведных вучэбных дысцыплінах.

ПК-33. Планаваць і ажыццяўляць адміністрацыйна-арганізацыйную дзейнасць арганізацыі (асобнага праекта) выканальніцкіх мастацтваў.

ПК-34. Арганізоўваць творчую і гастрольна-канцэртную дзейнасць харэаграфічных калектываў і выканаўцаў. Распрацоўваць стратэгію і тактыку кіравання танцавальнымі калектывамі розных тыпаў.

ПК-35. Ажыццяўляць неабходныя маркетынгавыя дзеянні для складання прагнозу эфектыўнасці арганізацыі (праекта), знаходзіць неабходныя фінансавыя сродкі для яго рэалізацыі.

У адпаведнасці з вучэбным планам праграма вучэбнай дысцыпліны разлічана на 278 гадзін, у тым ліку 160 – аўдыторныя (40 – лекцыі, 84 – практычныя заняткі, 26 – семінарскія заняткі, 10 – індывідуальныя заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Азнаямленне з асноўнымі мэтамі вучэбнай дысцыпліны «Творча-метадычныя асновы арганізацыі конкурсаў і спаборніцтваў па спартыўна-бальным танцы», асаблівасцямі спартыўнага бальнага танца сярод іншых відаў харэаграфічнага мастацтва, роляй яго ў фарміраванні выканальніцкіх навыкаў і тэарэтычных ведаў. Патрабаванні да студэнтаў на ўроках спартыўнага бальнага танца.

*Тэма 1. Гісторыя развіцця конкурснага руху ў свеце і ў Беларусі*

Гісторыя ўзнікнення конкурсаў па бальным танцы. Першыя конкурсы на пачатку XX ст. у Еўропе. Асаблівасці правядзення спаборніцтваў у пачатку XX ст. Гісторыя конкурснага руху ў Беларусі. Папулярныя спаборніцтвы ў Беларусі ў 70–80-я гг. XX ст. Асаблівасці правядзення турніраў у 90-я гг. XX ст. – першае дзесяцігоддзе XXI ст.

*Тэма 2. Правілы Сусветнай федэрацыі танцавальнага спорту (WDSF). Правілы правядзення спаборніцтваў па спартыўных бальных танцах у Беларусі. Работа судзейскай калегіі на конкурсе*

Правілы правядзення спаборніцтваў па спартыўных бальных танцах у Беларусі. Правілы правядзення класіфікацыйных конкурсаў. Правілы правядзення адкрытых і рэйтынгавых конкурсаў. Правілы выканання праграм на конкурсах. Правілы па касцюме. Палажэнне аб судзейскай калегіі. Правілы Сусветнай федэрацыі танцавальнага спорту (WDSF – World DanceSport Federation) па правядзенні турніраў катэгорый World Open, International Open і Open. Правы і абавязкі галоўнага суддзі конкурсу. Правы і абавязкі ацэначных суддзяў. Функцыі кантрольных суддзяў. На практычных занятках студэнты дэманструюць судзейства і робяць аналіз танца на вучэбных конкурсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Сучасная сістэма ацэнкі танцавальных пар. Новая сістэма ацэнкі танцавальных пар 2.0.*

Асноўныя характарыстыкі сучаснай сістэмы судзейства 2.0. Асноўныя кампаненты судзейскай ацэнкі (тэхнічныя аспекты танца і артыстычныя аспекты танца).

*Тэма 4. Сучасныя тэндэнцыі ў спартыўным выканнні еўрапейскіх танцаў. Прынцыпы судзейства еўрапейскіх танцаў. Сучасныя тэндэнцыі ў спартыўным выкананні лацінаамерыканскіх танцаў. Прынцыпы судзейства лацінаамерыканскіх танцаў*

Аналіз матэрыялаў штогодніх кангрэсаў у Англіі, Германіі, Расіі і іншых краінах, метадычных матэрыялаў і распрацовак танцавальных цэнтраў, відэазапісаў найбольш буйных конкурсаў па лацінаамерыканскай і еўрапейскай праграме.

Вядзенне практычных заняткаў з улікам сучасных дасягненняў узроўню танцавання класа «А» і вышэй.

Патрабаванні да суддзі. Псіхалогія судзейства. Крытэрыі судзейства: лініі корпуса, галавы, рук і ног; якасць руху; музыкальнасць; тэхніка. Прыярытэтнасць крытэрыяў для розных праграм, класаў і ўзроставых груп.

Асаблівасці судзейства папярэдніх і фінальных тураў, камандных спаборніцтваў. Крытэрыі судзейства ансамбляў: узровень выканальніцкага майстэрства; складанасць і чысціня выканання харэаграфіі; музыкальнасць выканання; камандная выразнасць.

*Тэма 5. Арганізацыя работы падліковай камісіі. Сістэма «Скейтынг», асноўныя правілы*

Патрабаванні да старшыні падліковай камісіі і яго задачы. Функцыянальныя абавязкі членаў падліковай камісіі. Падвядзенне вынікаў на папярэдніх этапах, правілы 1–4 і 5–8. Падвядзенне вынікаў фінальнай часткі конкурсу, правілы 9–11.

*Тэма 6. Правілы падвядзення вынікаў на розных відах конкурсаў*

Рашэнне разнастайных варыянтаў задач на асноўныя правілы Скейтынг-сістэмы. Аналіз спрэчных момантаў, узнікаючых на спаборніцтвах. Сістэма ацэньвання на турнірах рознага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рангу: для пачынаючых танцаваць удзельнікаў і для высокага ўзроўню пар.

*Тэма 7. Бізнес-план па арганізацыі танцавальнай студыі: асноўныя паняцці, правілы распрацоўкі і афармлення*

Паняцце «бізнес-план». Састаўныя часткі праекта: мэта, назва, абгрунтаванне, канцэпцыя, структура персаналу, этапы рэалізацыі праекта і іх адзнака, табліцы разліковых даных, цэнавая палітыка і маркетынгавы падыход. Аналіз існуючых прац па гэтай тэматыцы.

*Тэма 8. Работа рэжысёрска-пастановачнай групы па арганізацыі і правядзенні конкурсу*

Роля і асноўныя абавязкі мастацкага кіраўніка і адміністратараў. Патрабаванні да музычнага суправаджэння і абавязкі музычнага рэдактара. Абавязкі памочнікаў кіраўніка конкурсу (адміністратараў).

*Тэма 9. Бізнес-план па арганізацыі турніру па спартыўна-бальным танцы*

Паняцце «каштарыс». Правілы яго састаўлення. Аналіз разнастайных прыкладаў каштарыса. Састаўныя часткі праекта: мэта, назва, абгрунтаванне, канцэпцыя, этапы рэалізацыі праекта і іх адзнака, табліцы разліковых даных, цэнавая палітыка і маркетынгавы падыход.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | індывідуальныя заняткі | | |
| *Тэма 1.* Гісторыя развіцця конкурснага руху ў свеце і ў Беларусі | 4 | 8 | 2 | | 2 | вуснае апытанне |
| *Тэма 2.* Правілы Сусветнай федэрацыі танцавальнага спорту (WDSF). Правілы правядзення спаборніцтваў па спартыўных бальных танцах у Беларусі. Работа судзейскай калегіі на конкурсе | 2 | 6 | 2 | 2 | 4 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 3*. Сучасная сістэма ацэнкі танцавальных пар. Новая сістэма ацэнкі танцавальных пар 2.0. | 4 | 8 | 2 | | 4 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 4*. Сучасныя тэндэнцыі ў спартыўным выкананні еўрапейскіх танцаў. Прынцыпы судзейства еўрапейскіх танцаў. Сучасныя тэндэнцыі ў спартыўным выкананні лацінаамерыканскіх танцаў. Прынцыпы судзейства лацінаамерыканскіх танцаў | 4 | 6 | 2 | 2 | 4 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 5.* Арганізацыя работы падліковай камісіі. Сістэма «Скейтынг», асноўныя правілы | 4 | 6 | 2 | | 2 | пісьмовае апытанне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 6.* Правілы падвядзення вынікаў на розных відах конкурсаў | 4 | 8 | 2 | 2 | 4 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 7.* Бізнес-план па арганізацыі танцавальнай студыі: асноўныя паняцці, правілы афармлення | 6 | 10 | 2 | 2 | 4 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 8.* Работа рэжысёрска-пастановачнай групы па арганізацыі і правядзенні конкурсу | 2 | 8 | 2 | | 4 | рэферат |
| *Тэма 9.* Бізнес-план па арганізацыі турніру па спартыўна-бальным танцы | 2 | 8 | 2 | 2 | 4 | рэферат |
| **Усяго…** | 32 | 68 | 18 | 10 | 32 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Лэрд, У.* Техника исполнения латиноамериканских танцев / У. Лэрд ; пер. О. Р. Демидовой. – М. : АСТ, 1998. – 186 с.

2. *Лэрд, У.* Техника исполнения латиноамериканских танцев : дополнение / У. Лэрд ; пер. О. Р. Демидовой. – М. : АСТ, 1998. – 63 с.

3. *Мур, А.* Бальные танцы / А. Мур ; пер. С. Ю. Бардиной. – М. : Астрель, 2004. – 319 с.

4. *Ромэн, Э.* Вопросы и ответы на экзаменах уровня сложности «ассоушиэйт» по латине и стандарту имперского общества учителей танца / Э. Ромэн ; пер. О. Р. Демидовой. – М. : АСТ, 1998. – 76 с.

5. *Смит-Хэмпшир, Г.* Венский вальс. Как воспитать чемпиона / Г. Смит-Хэмпшир. – Ростов н/Д : Феникс, 2000. – 285 с.

6. Техника бальных танцев / Имперское общество учителей танца ; пер. С. Ю. Бардиной. – М. : Астрель, 1994. – 134 с.

7. *Ховард, Г.* Техника исполнения стандартных танцев / Г. Ховард. – М. : БММ АО, 1999. – 80 с.

8. Скейтинг-система. – М. : Артис, 2000. – 59 с.


*Дадатковая*


1. *Регаццони, Г.* Бальные танцы / Г. Регаццони ; пер. Г. Евдокимова. – М. : БММ АО, 2001. – 167 с.

2. Правила проведения соревнований / Белорусский Альянс Танцевального спорта [Электронный ресурс]. – Минск, 2000. – Режим доступа: http://www.sportdance.by.

3. DanceSport Competitions / The World DanceSport Federation [Electronic resource]. – Vancouver : BC, 1997. – Mode of access: http://www.wdsf.net.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

1. Комплексныя рознаўзроўневыя заданні:

– аналіз сучасных методык ацэнкі танцавальных дуэтаў на спаборніцтвах па спартыўна-бальным танцы;

– вывучэнне асноўных правіл правядзення турніраў па спартыўна-бальным танцы.

2. Вуснае і пісьмовае (тэсціраванне) апытанне студэнтаў.

3. Пісьмовая распрацоўка плана-праекта па арганізацыі турніраў па спартыўна-бальным танцы розных катэгорый (унутрыклубныя, рэспубліканскія, міжнародныя).

4. Пісьмовая распрацоўка бізнес-плана па арганізацыі танцавальнай студыі.

5. Пісьмовая распрацоўка каштарыса расходаў і даходаў пры правядзенні турніру па спартыўна-бальным танцы.

## Формы і змест самастойнай работы студэнтаў

1. Вывучэнне базавай літаратуры – падручнікаў, перыядычных выданняў, спецыялізаваных падручнікаў, канспектаванне вывучанай літаратуры.

2. Рэфераты на тэму аналізу сучасных тэндэнцый: у ацэньванні танцавальных пар, у зменах патрабаванняў да касцюмаў выканаўцаў, падрыхтоўкі і правядзення турніраў рознага рангу – ад унутрыклубных да міжнародных.

3. Падрыхтоўка наглядных схем, дыяграм для напісання бізнес-планаў.

4. Наведванне і ўдзел у спаборніцтвах у якасці гледачоў, выканаўцаў, памочнікаў арганізатараў конкурсаў.

5. Прагляд разнастайных конкурсаў з інтэрнэт-крыніц.

## Прыкладныя заданні для кіруемай самастойнай работы

1. Падрыхтоўка да практычных заняткаў (вывучэнне правілаў выканання танцавальных фігур на конкурсах, сістэмы «Скейтынг», сістэмы 2.0. і інш.).

2. Кантрольнае індывідуальнае заданне па тэме.

3. Наведванне спаборніцтваў, фестываляў, спектакляў і напісанне справаздачы па ім.

4. Тэст па пройдзенай тэме.

5. Выкананне творчага задання на зададзеную тэму.

6. Вусныя апытанні.

7. Заданні-правакацыі (з наяўнасцю памылак і іх выпраўленнем студэнтамі).

8. Творчы калёквіум па пройдзеных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ТВОРЧА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ АРГАНІЗАЦЫІ КОНКУРСАЎ І СПАБОРНІЦТВАЎ ПА СПАРТЫЎНА-БАЛЬНЫМ ТАНЦЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк          2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,76. Ул.-выд. арк. 0,40. Тыраж          экз. Заказ          .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ